Мае гады — маё багацце

ШТО ПАТРЭБНА СТАРЫМ?

СВАІМІ «дзіўнымі» паводзінамі «цяжкі стары» дае зразумець нам, яго сваякам і проста навакольным, што яму дрэнна, што не ўсе яго патрэбы задаволены. Таму старых не варта асуджаць, а неабходна дапамагчы ім набыць душэўную раўнавагу. А для гэтага трэба ведаць, напрыклад, якія псіхічныя расстройствы і захворванні ўласцівыя сталаму веку.

СТРАХ. У жанчын ва ўзросце пасля 60 гадоў мацней за ўсё праяўляецца страх перад адзінотай, хваробамі, дрэннымі людзьмі і смерцю. Мужчыны ва ўзросце 60-70 гадоў часцей перажываюць страх смерці, страх перад чужой ці ўласнай агрэсіяй, уласнай бездапаможнасцю, лёсам, учыненымі памылкамі, ім уласцівы і неспакой перад будучыняй.

ТРЫВОЖНАСЦЬ. У жанчын вышэй узровень адкрытай, знешняй трывожнасці. Мужчыны больш стрыманыя ў выражэнні трывожных пачуццяў. Пажылыя мужчыны з высокім узроўнем трывожнасці — часцей удаўцы. Іх вельмі непакоіць узровень жыцця (у матэрыяльным сэнсе), яго зніжэнне ў параўнанні з перыядам прафесійнай актыўнасці. Пагаршэнне стану здароўя (перанесены інфаркт міякарда, туберкулёз, астма) таксама негатыўна ўплывае на ступень эмацыйнай ураўнаважанасці. Важным негатыўным фактарам з'яўляюцца канфлікты або рэдкія і фармальныя кантакты з сям'ёй. Для мужчын характэрнае ўзмацненне трывожнасці па меры павелічэння часу знаходжання на пенсіі. Гэта звязана з тым, што паступова частка сяброў памірае, а зніжэнне фізічных магчымасцяў не дазваляе знайсці новыя кантакты і формы актыўнасці.

У жанчын на ўзмацненне трывожнасці ў першую чаргу ўплывае факт наяўнасці або адсутнасці сям'і. Калі для мужчыны большае значэнне мае якасць кантактаў з сям'ёй, то ў жанчын пераважае прынцып: «Любая сям'я лепш, чым ніякая». Старым жанчынам лягчэй апраўдаць несправядлівыя паводзіны і ўчынкі сваіх дзяцей, членаў сям'і, чым справіцца з адсутнасцю людзей, якім можна аддаць сваю любоў. З адзінотай вельмі цяжка справіцца жанчынам, якія раптам сталі адзінокімі ў старасці. Асабліва калі кантакты з навакольным светам ажыццяўляліся пры «пасрэдніцтве» мужа.

БОЯЗЬ СМЕРЦІ. Існуе ўзаемасувязь паміж адаптацыяй да старасці і стаўленнем да смерці. Рэлігійныя людзі перажываюць больш моцны страх, чым тыя, хто не веруе. У першых, акрамя апасенняў, звязаных з адыходам ад зямных спраў, выступае таксама страх, які тычыцца тагасветнага жыцця. Вельмі важна навучыцца распазнаваць свой псіхічны стан, адрозніваць напружанне страху і трывожнасці ад фізічных парушэнняў. Гэтае ўменне з'яўляецца першым крокам на шляху свядомага кіравання сваімі эмоцыямі, пераадолення тых з іх, якія з'яўляюцца сігналам парушэння сувязяў з іншымі людзьмі і самім сабой.

ПАРУШЭННЕ СНУ. Сон для пажылога чалавека яшчэ больш важны, чым для маладога. Рэзервовыя магчымасці нервовай сістэмы старых людзей значна зніжаныя, што прыводзіць да хуткага знясілення арганізма. Адна ноч, праведзеная без сну, моцна адбіваецца на настроі і стане псіхікі. Старыя з выражанай стомленасцю маюць патрэбу яшчэ і ў дадатковым сне днём.

ЗАТАРМОЖАНАСЦЬ У ПСІХІЦЫ І ПАВОДЗІНАХ...

...як вынік аднастайнага харчавання і дэфіцыту вітамінаў. Пажылы малазабяспечаны чалавек не можа набываць разнастайныя прадукты, гатаваць сабе паўнавартасную ежу. Як толькі харчаванне становіцца больш паўнацэнным, з'явы, якія нагадваюць дэменцыю, знікаюць.

...як вынік нізкай тэмпературы паветра ў доме. Павышэнне тэмпературы ў жыллі, паляпшэнне цеплаізаляцыі і рэгулярная гарачая ежа хутка вядуць да паляпшэння разумовых здольнасцяў і змены паводзін.

...як вынік празмернага прыёму лекаў. Бессістэмны і залішні прыём лекаў, асабліва снатворных, а таксама гіпатэнзіўных і супрацьалергічных вядзе да пагаршэння разумовай функцыі, кволасці і затарможанасці. Пасля спынення іх прыёму з'явы, падобныя на дэменцыю, могуць праходзіць.

ХВАРОБА АЛЬЦГЕЙМЕРА. Гэта захворванне галаўнога мозга праяўляецца дэменцыяй, якая паступова прагрэсуе. Дэменцыя — гэта зніжэнне такіх інтэлектуальных функцый, як абстрактнае мысленне, памяць, узровень суджэнняў, здольнасць да навучання, пісьма, маўлення і г.д. Прычыны ўзнікнення гэтай хваробы пакуль дакладна не ўстаноўлены. Тыповы ўзрост пачатку — пасля 65 гадоў. Вядучую ролю ў дапамозе гэтай катэгорыі хворых сёння адыгрывае не біялагічная тэрапія, а сацыяльна-асяродкавыя і псіхалагічныя ўздзеянні, правільны догляд, дапамога членаў сям'і, якія даглядаюць старога.

САСУДЗІСТАЯ ДЭМЕНЦЫЯ. Зніжэнне інтэлекту ў выніку парушэнняў мазгавога кровазвароту пачынаецца ў 50-60 гадоў. У мужчын сустракаецца крыху часцей. Прычына гэтай дэменцыі — назапашванне ачагоў некрозу ў рэчыве мозга, якое ўзнікае ў выніку некалькіх інсультаў, часцей за ўсё ішэмічных. Пачатак захворвання, у адрозненне ад дэменцыі, пры хваробе Альцгеймера адносна востры і выразны. Кантроль за артэрыяльным ціскам і яго пастаянная карэкцыя, лячэнне спадарожных паталогій — атлусцення, цукровага дыябету — поўная адмова ад курэння дае магчымасць папярэдзіць узнікненне сасудзістай дэменцыі ў здаровых людзей, якія маюць вельмі высокую рызыку развіцця гэтай хваробы.

ДЭПРЭСІЯ. Часам выпадкі дэпрэсіі ў пажылых людзей нагадваюць дэменцыю. Многія пажылыя людзі з дэпрэсіўным сіндромам кажуць аб тым, што яны віталі б смерць, калі б яна надышла хутка і без болю. Пры моцнай дэпрэсіі чалавек часта не адказвае на пытанні, не можа правільна арыентавацца ў часе і прасторы. Калі на зніжэнне памяці і інтэлекту скардзіцца сам пажылы, але не яго блізкія, то гэта дэпрэсія; калі скардзяцца блізкія, але пацыент гэтага не заўважае, то гэта дэменцыя.

— Старым людзям неабходна пастаянна трэніраваць свае інтэлектуальныя магчымасці з дапамогай розных відаў нагрузкі — такіх, як чытанне, лік, завучванне вершаў, вывучэнне замежных моў і г.д. — кажа **дацэнт кафедры рэабіліталогіі Дзяржаўнага інстытута ўпраўлення і сацыяльных тэхналогій БДУ, кандыдат медыцынскіх навук Уладзімір МІЛЬКАМАНОВІЧ**. — Асаўленне новай інфармацыі, веданне праблем, плыняў палітычнага і эканамічнага жыцця сваёй краіны і свету спрыяюць захаванню здаровай псіхікі састарэлага чалавека... Комплекснае лячэбнае ўздзеянне на псіхіку аказвае падтрымаанне стасункаў са старымі. Любы стары мае патрэбу ў суразмоўцы, спачуванні, пяшчотных словах. А ўвогуле здароўе пажылога чалавека, перш за ўсё псіхалагічнае, можа быць захавана яго ўласнымі намаганнямі, разуменнем працэсаў, якія адбываюцца ў арганізме, і фактараў, якія процідзейнічаюць хваробам і немачы. Агульная культура чалавека як у маладыя гады, так і ў сталым веку мае вырашальнае значэнне. Дапамагчы падтрымаць гэтую культуру закліканы медыцынскія і сацыяльныя работнікі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Віншуем!

Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі — 80 гадоў

9-10 лістапада ў Мінску праходзіць Міжнародны кангрэс «Новыя падыходы ў сістэме паслядыпломнай адукацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў», прымеркаваны да юбілею БелМАПА — унікальнага вучэбна-педагагічнага і навуковага цэнтра, які павышае кваліфікацыю, ажыццяўляе перападрыхтоўку ўрачоў, выкладчыкаў медыцынскіх ВНУ і вучоных Беларусі. Штогод супрацоўнікі акадэміі атрымліваюць звыш 30 патэнтаў і станоўчых рашэнняў на вынаходніцтвы. БелМАПА супрацоўнічае з медустановамі, ВНУ, навукова-даследчымі і навукова-практычнымі цэнтрамі краін СНД, Швецыі, Італіі, Польшчы, Аўстрыі, Японіі, Турцыі.

Паводле слоў прарэктара па навуковай рабоце акадэміі Таццяны КАЛІНІНАЙ, штогод павышаюць кваліфікацыю і праходзяць перападрыхтоўку звыш 15 тысяч урачоў. Вучэбнымі базамі кафедраў БелМАПА з'яўляюцца 55 лячэбна-прафілактычных арганізацый рэспублікі, у тым ліку 8 РНПЦ, 6 устаноў аховы здароўя рэспубліканскага падпарадкавання, 8 устаноў аховы здароўя Мінскай вобласці, 32 установы аховы здароўя Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама. У акадэміі працуюць чатыры факультэты — тэрапеўтычны, хірургічны, педыятрычны і грамадскага здароўя. Яны дазваляюць забяспечыць высокі ўзровень паслядыпломнай падрыхтоўкі спецыялістаў медыцынскага профілю практычна па ўсіх раздзелах сучаснай аховы здароўя. Дзейнічаюць курсы па рэфлексатэрапіі, гамеапатыі, мануальнай тэрапіі, касметалогіі, лазерных тэхналогіях у медыцыне, пластычнай хірургіі і г.д. У 2008 годзе была адкрыта кафедра кардыяхірургіі, якую ўзначаліў прафесар Юрый Астроўскі. Пачынаючы з 2009 года, пры кафедры функцыяную курс трансплантаталогіі. Сёння рэктар акадэміі — член-карэспандэнт НАН Беларусі, прафесар Юрый Дзямідчык, які ўзначальвае ў краіне школу ўрачоў-анколагаў са спецыялізацыяй па шчытападобнай залозе.

Дарэчы, на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння функцыяную прафесарскі лячэбна-кансультацыйны цэнтр БелМАПА, дзе можна атрымаць кансультацыю больш як 100 прафесараў і дацэнтаў акадэміі, галоўных і вядучых спецыялістаў Беларусі па 30 спецыяльнасцях. Паслугі аказваюцца па дзяржаўных тарыфах. Звярнуцца ў цэнтр можа любы ахвотны, без накіравання, згодна з папярэднім запісам.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У МІНСКАЙ АБЛАСНОЙ дзіцячай клінічнай бальніцы цяпер праводзяць аперацыі па эндапратэзаванні сярэдняга вуха пры хранічным атыце.

Дагэтуль аперацыі па паляпшэнні слыху праводзіліся толькі ў РНПЦ атарыналарынгалогіі. Паводле слоў загадчыцы атарыналарынгалагічнага аддзялення для дарослых бальніцы Алены КАРЖАНЕВІЧ, хірургічнае ўмяшанне выканана шасці пацыентам. Правядзенне самых складаных аперацый па карэкцыі хірургічнай, лор- і афтальмалагічнай паталогій у Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы ажыццяўляецца зараз і ў новым хірургічным корпусе з аснашчанымі сучаснай апаратурай аперацыйнымі.

Карысна ведаць

З МЫШАМІ — АСЦЯРОЖНЕЙ!

Гемарагічная ліхаманка з нырачным сіндромам (ГЛНС), або «мышыная» ліхаманка — вострае вірусное прыродна-ачаговае захворванне. Узбуджальнікам з'яўляецца вірус, які перадаецца ляснымі мышападобнымі грызунамі: рудой і чырвона-шэрай палёўкай, палявой мышшу, радзей — дамавым пацуком.

Заражэнне людзей можа адбывацца круглы год, але часцей у летне-асенні перыяд пры наведванні лесу, зборы грыбоў, ягад, паляванні, рыбнай лоўлі, падчас працы на садова-агародных участках, збору ўраджаю. З наступленнем халадоў грызуны перасяляюцца ў жылыя памяшканні, месцы захоўвання прадуктаў, фуражу, таму заражэнне становіцца магчымым у бытавых умовах.

Заражэнне чалавека адбываецца пры кантакце з выдзяленнямі (калам, мачой, слінай) грызуноў, пры ўдыханні пылу, які змяшчае выдзяленні інфіцыяваных грызуноў. Дапускаецца магчымасць заражэння чалавека элементарным шляхам, напрыклад, пры ўжыванні прадуктаў (капуста, морква і інш.), забруджаных грызунамі, якія не былі тэрмічна апрацаваны.

Людзі дастаткова ўспрымальныя да захворвання, але для навакольных хворы чалавек не ўяўляе небяспекі. Перанесеная інфекцыя пакідае пасля сябе ўстойлівы імунітэт.

Ад моманту заражэння да з'яўлення першых прыкмет захворвання праходзіць ад 7 да 36 дзён (часцей 2—3 тыдні). Хвароба пачынаецца з павышэння тэмпературы (39—40 °С). Адзначаюцца моцныя галаўныя і мышачныя болі, часам пагаршэнне зроку, з'яўляюцца смага і сухасць у роце. Напрыканцы першага або на другі дзень хваробы ў многіх з'яўляюцца млоснасць і ваніты, якія нарастаюць на працягу бліжэйшых дзён, часта ўзнікае ікаўка. На скуры плечавога пояса і ў падпахавых ямках можа з'яўляцца гемарагічны сып у выглядзе адзінкавых або дробных множных крывазліццяў. Магчымыя крывазліцці ў кан'юнктыву склер, павелічэнне ломкасці капіляраў. Асабліва тыповы для «мышынай» ліхаманкі нырачны сіндром: моцныя болі ў жываце і паясніцы, рэзкае зменшэнне колькасці мачы, прысутнасць у ёй крыві. Пашкоджанне нырак праяўляецца таксама ў азызласці твару, ацёчнасці павек.

Найбольш сур'ёзныя ўскладненні: інфекцыйна-таксічны шок, ацёк лёгкіх, вострая нырачная недастатковасць, разрыў ныркі, крывазліцці ва ўнутраныя органы.

Як папярэдзіць захворванне гемарагічнай ліхаманкай з нырачным сіндромам?

На жаль, прафілактычных прышчэпак супраць ГЛНС не існуе. Усе меры прафілактыкі накіраваны на прадухіленне кантакту чалавека з грызунамі, з іх выдзяленнямі і на ахову прадуктаў харчавання і вады ад забруджвання.

Каб папярэдзіць заражэнне ГЛНС, неабходна прымаць наступныя меры засцярогі:

— не ўжываць у ежу прадукты, сапсаваныя грызунамі;

— не ўжываць сырую ваду, а таксама ваду з невядомых крыніц;

— выкарыстоўваць падчас працы на агародзе, догляду свойскіх жывёл ахоўнае адзенне, пальчаткі;

— захоўваць правілы асабістай гігіены: мыць рукі перад ядой, трымаць харчовыя прадукты ў тары, абароненай ад пранікнення грызуноў;

— забяспечыць непранікальнасць для грызуноў гаспадарчых пабудоў і жылых памяшканняў;

— у дачных дамках, падвалах выкарыстоўваць пасткі і хімічныя сродкі (атручаныя прынады) для барацьбы з грызунамі, пры гэтым памятаць пра бяспеку людзей;

— прыбіранне памяшканняў, дзе выяўлены выдзяленні грызуноў, праводзіць у пальчатках і шматслаёвай марлевай павязцы вільготным спосабам з прымяненнем дэзынфікуючых сродкаў; пасцельную бялізну, адзенне, асабістыя рэчы неабходна прасушыць на сонцы, а затым старанна выбіць пыл;

— не лавіць і не браць у рукі грызуноў або іх трупы;

— падчас знаходжання на прыродзе варта пазбягаць зараснікаў травы, а запасы ежы неабходна захоўваць у недаступных для мышэй месцах;

— пры наведванні лесу пазбягаць начлегу ў стагах сена, у закінутых будынках, не выкарыстоўваць для подсцілаў леташняе сена або салому.

Лячэнне хворых на ГЛНС праводзіцца толькі ў стацыянары! Таму пры з'яўленні сімптомаў захворвання не займайцеся самалячэннем — звярніцеся да ўрача.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Халадзільнікі no frost — рассаднікі кішэчнай палачкі?

Хто б мог падумаць, што халадзільнікі могуць уяўляць сапраўдную пагрозу для здароўя і жыцця сваіх гаспадароў? Тым не менш гэта факт: даследчыкі сцвярджаюць, што ў некаторых аддзяленнях халадзільніка можа жыць вялізная колькасць хваробатворных мікраарганізмаў. Найбольшая небяспека хаваецца ў скрынях для гародніны і садавіны.

Аб'ектам даследавання навукоўцаў сталі халадзільнікі з тэхналогіяй замарожвання no frost (без інею), якія не патрабуюць размарожвання, а таму вельмі рэдка мыюцца. У выніку ў скрынях, якія дасталі з 30 хатніх халадзільнікаў, было знойдзена ў сярэднім 7,85 тысячы калонеўтваральных адзінак бактэрый на 1 квадратны сантыметр. У рэдкіх выпадках іх колькасць даходзіла да каласальных памераў — 129 тысяч на 1 квадратны сантыметр. З небяспечных узбуджальнікаў у скрынях былі знойдзены кішэчная палачка, сальманэла і лістэрыя.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

9 лістапада — галоўны ўрач 37-й мінскай гарадской паліклінікі Леанід Анатольевіч БАГДАНАЎ.

10 лістапада — галоўны ўрач 25-й мінскай дзіцячай паліклінікі Ірына Віктараўна ПАКІДЗЬКА.

11 лістапада — галоўны ўрач 10-й мінскай гарадской паліклінікі Святлана Іванаўна ЦАБКАЛА.

Упраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 222 70 80

9 лістапада — загадчык аддзялення рэнтген-эндаваскулярнай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Дзмітрый Іосіфавіч КАРПОВІЧ.

10 лістапада — загадчык клініка-дыягнастычнай лабараторыі Мінскага абласнога радзільнага дома Тамара Аляксандраўна СЯРЖАН.

11 лістапада — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аксана Уладзіміраўна ЗАРОДАВА.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 18 ноября 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **14.11.2011** года до 15.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Победитель аукциона обязан: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 9 миллионов рублей.

№ лота	Адрес земельного участка, по ПДП «Детальный план индивидуальной жилой застройки в районе деревни Городщина Могилевского района»	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 44	участок № 175	0,1138	740100000001005960	983 974	33 488 000	3 014 000
№ 45	участок № 176	0,1050	740100000001005961	939 972	30 898 000	2 781 000
№ 46	участок № 177	0,1050	740100000001005962	938 508	30 898 000	2 781 000
№ 47	участок № 178	0,1050	740100000001005963	938 508	30 898 000	2 781 000
№ 48	участок № 179	0,1045	740100000001005964	954 052	30 751 000	2 768 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

г. ВИТЕБСК 19.12.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 50 %

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Неиспользуемое здание аптеки № 69 с тремя пристройками, уборной и неиспользуемое здание склада, расположенные по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Борковский с/с, д. Борковичи, ул. Железнодорожная, 15, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-61244 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) одноэтажное щитовое, облицованное кирпичом, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя кирпичными пристройками, дощатой пристройкой и крыльцами деревянными, общей площадью 87,3 кв.м, уборной; капитальное строение с инвентарным номером 251/С-62539 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) одноэтажный деревянный склад, фундамент бутовый, перекрытия деревянные, крыша шиферная, общей площадью 23,3 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221081201601000003, площадь 0,0481 га для использования под Борковичскую сельскую аптеку № 69, сроком аренды 50 лет. Ограничения (обременения) – охранная зона линии связи, площадь 0,0070 га. Использование – для содержания и обслуживания зданий.	19137891	1913780
2	Неиспользуемое здание бывшей аптеки № 126, расположенное по адресу: Витебская область, Дубровенский район, Кленовский сельский совет, дер. Клены, ул. Кленовская, 5, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение, инв. № 241/С-2389 (здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг) - одноэтажное бревенчатое,1962 года постройки, фундамент – бетонный, перекрытия – деревянные, крыша – шиферная, общая площадь 72,3 кв.м, с верандой. Земельный участок: с кадастровым номером 222482502101000002, площадью 0,0310 га, для содержания и обслуживания здания бывшей аптеки № 126, сроком аренды 50 лет. Ограничения в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В и в водоохранной зоне р. Луки площадью 0,0310 га.	8021421	802140
3	Неиспользуемое здание отделения связи, расположенное по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, Бельковщинский с/с, дер. Жовнино, ул. Школьная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 251/С-11004 (одноэтажное деревянное здание отделения связи) одноэтажное деревянное с деревянной холодной пристройкой, фундамент бутовый, крыша шиферная, перекрытия деревянные, общая площадь 46,2 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 221083603101000001, площадь 0,0420 га для использования под отделение связи в деревне Жовнино, ул. Школьная, 1, сроком аренды 50 лет. Ограничение в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В на площади 0,0015 га. Разрешить победителю аукциона в установленном порядке использовать земельный участок для содержания и обслуживания здания.	8770811	877080

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится 19 декабря 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 16.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 19.12.2011 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

2. Участник, ставший **победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

3. Подробная информация о продавцах, условиях аукциона, условиях участия в аукционе опубликована в газете «Звязда»: за 11.06.2011 № 108 (26981), за 09.07.2011 № 128 (26992) и за 23.07.2011 № 138 (27002).

г. ВИТЕБСК 16.12.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи лота, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи	Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу. Назначение – для использования под производственную базу.	Одна базовая величина	Одна базовая величина
2.	Не завершенный строительством объект «Музей-усадьба И. Буйницкого», расположенный по адресу: Витебская область, Глубокский район, Прозорокский с/с, д. Прозороки, ул. Вокзальная, 22	Характеристика объектов недвижимости: незавершенный строительством объект, общая площадь 505,7 кв.м, фундамент – ж/б блоки, перекрытия – ж/б плиты, стены блочные – облицованные кирпичом, кровля – нет, полы – нет, проемы – нет, внутренняя отделка – нет. Процент готовности – 10 %. Земельный участок: с кадастровым номером 221585411601000187 площадью 0,2567 га для обслуживания объекта «Музей-усадьба И. Буйницкого».	Одна базовая величина	Одна базовая величина

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон/факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: fondvitebsk@tut.by.

ПРОДАВЕЦ: лота № 1 – Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», контактный телефон (02133) 31333, 37637;

лота № 2 – Учреждение «Государственный музей истории театральной и музыкальной культуры Республики Беларусь», контактный телефон (017) 2270544.

Условия продажи недвижимости: по лоту № 1 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи; по лоту № 2 – создание на территории приобретаемого объекта постоянно действующей экспозиции, посвященной деятельности И. Буйницкого; осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Аукцион состоится «16» декабря 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 15.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 16.12.2011 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

7. Извещения о проведении аукционов были опубликованы ранее в газете «Звязда» от 27.09.2011 № 184 (27047), от 21.09.2011 № 180 (27044).